# ВЫСОКИЙ ПОТЕНЦИАЛ СТУДЕНЧЕСТВА

**28-29 февраля в Минске состоялся первый Республиканский студенческий форум.**

**Организаторами форума стали Министерство образования Республики Беларусь, Общественное объединение «Белорусский республиканский союз молодежи» и Федерация профсоюзов Беларуси в лице студенческих профсоюзов. Мероприятия такого масштаба в истории нашего государства еще не было. Свыше 800 делегатов – представители 43 государственных и 16 частных вузов нашей республики собрались для того, чтобы обсудить свои идеи, поделиться опытом, выработать конкретные предложения по улучшению положения белорусского студенчества. Наш вуз представляли 25 делегатов, студенты всех факультетов университета. Впервые у студентов появилась реальная возможность заявить о своих проблемах на самом высоком уровне, в присутствии высших должностных лиц государства.**

**В течение двух дней молодые люди обсуждали самые насущные проблемы, работали в секциях, вырабатывали конкретные решения наиболее важных проблем, возникающих в студенческой среде.**

*Сегодняшние студенты осознают, что они – завтрашний потенциал республики, что именно им предстоит принимать судьбоносные решения во благо нашего государства. Поэтому форум проходил под девизом «Молодежь за сильную и процветающую Беларусь».*

## СЕКЦИИ, КОТОРЫЕ РАБОТАЛИ НА ФОРУМЕ:

**«СОЦИАЛЬНОЕ ПОЛОЖЕНИЕ СТУДЕНЧЕСТВА»**

Обсуждался комплекс проблем обеспечения социальных гарантий студенчества: стипендий, расселения в общежитиях и решения вопросов прописки, пользования услугами культурно-просветительных учреждений, пользования льготами на проезд.

Секцию вели: Коханский С. В. — заместитель начальника главного управления производственной и социально-экономической работы аппарата Совета Федерации профсоюзов Беларуси; Бубен С. С. — заведующий отделом по работе с учреждениями профессионального образования и науки Белорусского профсоюза работников образования и науки.

**«КОЛЛЕКТИВНО-ДОГОВОРНЫЕ ОТНОШЕНИЯ В ВУЗАХ»**

Обсуждались основные подходы и механизмы защиты интересов студенчества через генеральное, отраслевое соглашение, обобщался опыт заключения Коллективных договоров в вузах по включению разделов, отражающих социальные гарантии студентов

Секцию вела Чеботова Т.И.— председатель Белорусского профсоюза работников образования и науки.

**«ЗДОРОВЬЕ И ЗДОРОВЫЙ ОБРАЗ ЖИЗНИ СТУДЕНТОВ»**

Обсуждался комплекс вопросов, связанных с организацией условий для обеспечения полноценного питания студентов, деятельности студенческих профилакториев и поликлиник, спортивных площадок и залов, с формированием в студенческой среде культуры здорового образа жизни.

Секцию вели: Сизанов А.Н.— главный специалист Главного управления социальной и воспитательной работы Министерства образования Республики Беларусь; Сивердев Ю. Г. — начальник отдела воспитательной работы Республиканского института высшей школы.

**«СТУДЕНЧЕСКОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ В ВУЗЕ»**

Обсуждалась проблема нормативно-правового решения проблем самоуправления вузами, развитие договорных отношений между администрацией и студенческими структурами, финансовой самостоятельности органов студенческого самоуправления, взаимодействие различных студенческих структур (студсовет, клубы, общественные объединения, профсоюзы).

**«ОРГАНЫ ГОСУДАРСТВЕННОЙ ВЛАСТИ УПРАВЛЕНИЯ И СТУДЕНЧЕСТВО: МЕХАНИЗМЫ ВЗАИМОДЕЙСТВИЯ»**

Обсуждались вопросы необходимости органов самоуправления студентов и их нормативно-правового обеспечение.

Руководитель секции - Ковалева Татьяна Николаевна (куратор) — заместитель министра образования Республики Беларусь.

**«СТУДЕНТЫ И РЕФОРМА ВЫСШЕЙ ШКОЛЫ»**

Обсуждались проблемы качества образования, организации учебного процесса, выбора учебных дисциплин информационного и методического обеспечения учебного процесса, перехода на новую систему оценки знаний, на двухуровневую систему подготовки специалистов.

Секцию вел Ветохин Сергей Сергеевич — проректор по научной работе Республиканского института высшей школы.

Будущие бакалавры, специалисты и магистры всерьез озабочены проблемой качества образования. В условиях конкуренции на рынке труда работодателей в большей степени интересует, что умеет молодой специалист, а не что знает. В своем выступлении министр образования Александр Радьков признал, что практическими навыками выпускник обладать обязан, но при этом не должна пострадать фундаментальная основа знаний – то, что делает человека понастоящему образованным.

**«ПЛАТНЫЕ УСЛУГИ В СФЕРЕ ВЫСШЕГО ОБРАЗОВАНИЯ»**

Обсуждались вопросы оказания платных услуг государственными вузами и платного обучения в вузах негосударственной формы собственности, обоснованности размера и условий оплаты, процедуры и условий перевода обучающегося с одного вида обучения на другой.

Секцию вела Суботская Лидия Ивановна — начальник Главного управления социально экономического развития Министерства образования Республики Беларусь.

**«МЕЖДУНАРОДНОЕ СОТРУДНИЧЕСТВО И СТУДЕНТЫ»**

Обсуждались вопросы участия студентов в межвузовских обменах, стажировках, образовательных и социальных программах для студенчества за рубежом, а также проблемы адаптации иностранных студентов, включения в учебно-воспитательный процесс вузов, взаимодействия с землячествами иностранных студентов.

Секцию вела Калачева Ирина Владимировна — доцент кафедры управления высшей школы Республиканского института высшей школы.

**«СТУДЕНЧЕСКИЕ ИНИЦИАТИВЫ: РЕСУРСЫ ВОСПИТАНИЯ»**

Обсуждались вопросы активизации социально значимой деятельности студентов через вовлечение в деятельность общественных объединений и инициатив, включения студенчества в работу по профилактике негативных явлений в молодежной среде, реализации лидерских программ для студентов.

Секцию вел Бутрим Георгий Алексеевич — начальник Главного управления социальной и воспитательной работы Министерства образования Республики Беларусь.

**«ВРЕМЕННАЯ ЗАНЯТОСТЬ И ТРУДОУСТРОЙСТВО»**

Обсуждались вопросы нормативно-правового обеспечения временной занятости студентов, создания специализированных структур для содействия временной занятости и самозанятости студентов, вопросы распределения выпускников вузов.

Секцию вел Карпик Евгений Иосифович — секретарь Центрального комитета Общественного объединения «Белорусский республиканский союз молодежи».

**«НАУЧНО-ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКАЯ РАБОТА СТУДЕНТОВ»**

Обсуждались вопросы информационного обеспечения студентов в области научно-исследовательской работы, создания условий вовлечения студентов в работу НИРС, обобщения имеющегося опыта организации работы советов молодых ученых в вузах.

Секцию вел Реут Олег Павлович — начальник управления науки и подготовки научных кадров Министерства образования Республики Беларусь.



**Делегаты ГГУ им. Ф. Скорины вместе с ректором профессором А.В. Рогачевым перед началом работы Республиканского студенческого форума.**

## СОЦИАЛЬНЫЙ ПОРТРЕТ В ЗЕРКАЛЕ ИССЛЕДОВАНИЯ

✱ Более половины опрошенных студентов Беларуси в целом удовлетворено уровнем организации образовательного процесса, общения с преподавателями. Правда есть и те, кто не совсем доволен профессиональным выбором, качеством учебы, преподавателями. И таких — почти пятая часть среди опрошенных студентов. А это уже для нас информация к размышлению.

✱ Подавляющее большинство наших студентов — это оптимисты и реалисты. Лишь 3-5% пессимистов, скептиков, равнодушных. Верить в лучшее, трезво оценивать ситуацию и свои возможности — прекрасные предпосылки для будущего. Стремление молодежи жить лучше, изменить ее — хороший потенциал для развития общества. При этом для большинства студентов характерны разумные, здоровые формы удовлетворения материальных потребностей. Основная их часть — противники незаконных способов обогащения: крайне негативно и отрицательно к ним относится 61% студентов. Настораживает то, что 13% студентов считают эти формы нормальным явлением. К тому же, как отмечается, наметилась тенденция потребительства в студенческой среде. Положительно к этому относятся 16% студентов.

✱ 73% студенчества считают наиболее значимой потребность в самореализации себя как личности.

## ОБРАЩЕНИЕ

### делегатов Республиканского студенческого форума 29 февраля 2004 г., г.Минск

Основную роль для развития и процветания любой страны играет эффективное использование национальных ресурсов. Основным ресурсом нашей Родины — Республики Беларусь — является ее человеческий потенциал, интеллектуальные и творческие способности наших граждан. Важную часть этого потенциала составляет молодежь Беларуси. Хотя молодежь и рассматривается как уязвимая и проблемная социальная группа, нельзя забывать, что молодежь для общества — в первую очередь ресурс, а не проблема. Молодежь не только в будущем, а уже сегодня способна вносить весомый вклад в развитие общества. И особенно справедливо это утверждение по отношению к студенческой молодежи.

В студенческой среде традиционно концентрируется наиболее активная и творческая часть молодежи. Студенты одними из первых в нашем обществе овладевают новыми идеями, технологиями, передовыми разработками в различных областях жизнедеятельности. Им присущи активная жизненная позиция, патриотизм, самостоятельность, инициативность и социальная мобильность. В студенческой среде активно генерируются оригинальные идеи и подходы, рождаются социально полезные инициативы.

Создавая условия для самореализации студенческой молодежи, поддерживая конструктивные студенческие инициативы, можно добиться не только решения большинства проблем студенчества, но и прогресса в развитии общества в целом.

Руководство нашей страны, органы власти и управления всех уровней уделяют серьезное внимание вопросам молодежной политики: в вопросах обеспечения доступности образования, молодежного жилищного строительства, временной занятости молодежи наше государство является бесспорным лидером среди стран СНГ.

Но нельзя останавливаться на достигнутом: совершенствуя молодежную политику, государство может в больших масштабах задействовать ресурс студенчества для развития и процветания нашей Родины. В первую очередь, необходимо модернизировать правовую базу государственной молодежной политики и выйти на принятие кодекса законов о молодежи, включающего такие законоположения как:

– обеспечение для молодежи представительства в законодательных и представительных органах, пропорционального количеству молодых избирателей в нашей стране;

– легитимность коллективных договорных отношений студентов с администрацией учебных заведений;

– установление обязательного норматива финансирования государственной молодежной политики в процентном отношении к ВВП;

– включение строительства социально значимых объектов системы высшего образования в республиканскую и местные инвестиционные программы;

– создание механизма финансирования студенческих инициатив из средств Республиканской программы «Молодежь Беларуси» и местных молодежных программ.

Мы обращаемся к органам государственной власти и управления с призывом внимательно рассмотреть рекомендации, выработанные на форуме, и использовать их для совершенствования соответствующих направлений социальной политики нашего государства.

Мы обращаемся ко всем студентам Беларуси с призывом сохранять приверженность нашим общим жизненным ценностям: стремлению к личностному и развитию общества, патриотизму, здоровому образу жизни и здоровой семье. Сегодня студенчество Беларуси достойно продолжает славные традиции европейской университетской культуры. Об этом свидетельствуют научные достижения, победы на международных олимпиадах, высокий уровень художественного творчества и физической культуры, дух студенческого братства и солидарности. Следуя этим ценностям, сохраняя лучшие традиции студенчества, мы сможем укрепить позитивный имидж студенческой молодежи в глазах наших соотечественников, расширить возможности, как для личного развития белорусских студентов, так и для их участия во всех областях общественной жизни нашей страны.

**Беларусь и студенчество – вместе к процветанию!**

**Игорь КАЗАКОВ, секретарь комитета БРСМ ГГУ:**

– Как показала работа секций, многие студенческие проблемы уже сейчас своими силами решают вузовские комитеты Белорусского республиканского союза молодежи и студенческих профсоюзов. Найти новые направления решений насущных студенческих проблем и стало целью проведения форума. Студенческая молодежь олицетворяет собой субъект активного действия. Каждое новое поколение студентов, осваивая уже сложившуюся деятельность, вносит в нее свои радикальные изменения, содействуя тем самым изменению и самого государства. Видоизменять деятельность, проявлять социальную активность и инициативу, перестраивать образ жизни и мыслей, создавая новую реальность, – это и означает занимать передовые позиции в обществе.

Стремление молодежи жить лучше – хороший потенциал для развития общества, помочь им в этом – вот актуальное поле для деятельности молодежных общественных организаций.

Безусловно, сегодня непростое время, как для Беларуси, так и для белорусского студенчества. Я думаю, что многие предложения и замечания, высказанные делегатами форума, найдут отражения в дальнейших решениях, принимаемых министерствами и ведомствами, органами власти и администрациями вузов.

27-га сакавіка – Міжнародны дзень тэатра



*Театр – это живой организм, умный, внимательный, способный в ненавязчивой, часто игривой форме дать нужный совет, изменить внутренний мир человека…*

# ШТО ЗАСТАНЕЦЦА ПАСЛЯ НАС?…

Зараз шмат размоў вядзецца вакол пытанняў: "Што сёння трэба, каб глядач пайшоў у тэатр? Якая драматургія павінна быць у аснове сучаснага тэатра? Якая праблематыка?" Зразумела што актуальная, якую кожны зможа распазнаць! І класічная, але актуалізаваная.

Сур'ёзную заяўку на сучаснае бачанне драматургічнага працэсу ў Беларусі зрабіў гомельскі пісьменнік і драматург Васіль Ткачоў. Ён добра валодае пачуццём часу, яго няўмольнага і імклівага бегу. Аўтару шматлікіх твораў, сярод якіх п'есы "Усміхаўся месяц белай вішні…", "Шкірдзюкі займаюць абарону", "Нехта ходзіць за вакном", "Стары і дарога" і іншыя, давялося быць сведкам і дабрабытнага брэжнеўскага часу, і перабудовачных гарбачоўскіх пераўтварэнняў, развалу Саюза, татальнай антыалкагольнай кампаніі… Усялякі раз гэтыя падзеі прыносілі не радасць перамог, а горыч паражэнняў – палітычных, сацыяльных, культурных, духоўных. Водгукі гэтага знайшлі сваё адлюстраванне і ў "Перапалоху", апошнім спектаклі на п'есе В.Ткачова, пастаўленым на сцэне Гомельскага абласнога драмтэатра.

У яго аснову, прэм'ера якога адбылася нядаўна, пакладзены сюжэт п'есы "Шкірдзюкі займаюць абарону". Яе шматразова ставілі на малых сцэнах у Мазыры, Рагачове. Нашы універсітэцкія акцёры тэатра-студыі "Если бы…" неаднаразова прадстаўлялі гэты спектакль і на гарадскіх пляцоўках, і, зразумела, на сцэне актавай залы нашай вну. І заўсёды з вялікім поспехам! Дарэчы, калектыў тэатра-студыі "Если бы…" з гэтай п'есай абараняў сваё званне "народны", з ёю стаў і лаўрэатам І рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці "Беларусь – мая песня":

– Тады мы выступалі на сцэне Гомельскага аблдрамтэатра, а гэта вельмі пачэсна для самадзейнага калектыву, – гаворыць мастацкі кіраўнік тэатра-студыі "Если бы…" Генадзь Варонін. – З Васілём Ткачовым ужо колькі год мы падтрымліваем цесную сувязь. Ён прапаноўвае нашай студыі свае новыя п'есы і дае права выбару. Васіль Юр'евіч заўсёды ўдзельнічае ў рэпетыцыйным працэсе падрыхтоўкі спектакляў па яго творах, і яго прысутнасць для нас вельмі каштоўная. Гэта вельмі просты, шчыры ў адносінах, цікавы, ініцыятыўны, не абыякавы да жыцця чалавек. З ім заўсёды лёгка. Я ведаю, што яму вельмі падабаецца наш калектыў, падабаецца акцёрская гульня Святланы Карчэўскай (роля Вавёркі) і Андрэя Пацкова (роля дзеда Квача) у спектаклі "Шкірдзюкі займаюць абарону", Святланы Гандыш (роля Ягорыхі) у пастаноўцы "Нехта ходзіць за вакном…"

– Але "Перапалох" – гэта зусім іншая п'еса, чым "Шкірдзюкі…", што ў зборніку маіх драматургічных твораў, які быў надрукаваны ў 2003 годзе, – патлумачыў сам драматург В.Ткачоў.

– П'есы Васіля Ткачова я назваў бы сучаснай авангарднай драматургіяй, якая змяшчае іншую, у параўнанні з ранейшымі ўзорамі, філасофію, іншыя ідэі. Да таго ж яго п'еса "Перапалох", якую мы паставілі ў вашым тэатры, створана на глебе нацыянальнага матэрыялу", – гаворыць рэжысёр-пастаноўшчык, мастацтвазнаўца, загадчык кафедры рэжысуры Беларускай акадэміі мастацтваў Рыгор Іванавіч Баравік, якога спецыяльна запрасілі ў гомельскі тэатр для пастаноўкі п'есы В.Ткачова.

– У нашых тэатрах пакуль не было спектакляў пра сучасных беларусаў, – працягвае думку рэжысёра Васіль Ткачоў. – Таму мы з Рыгорам Іванавічам і вырашылі зрабіць чыста беларускую п'есу.

Васіль Ткачоў бадай што адзіны з айчынных драматургаў, які ўбачыў адну з самых набалелых праблем нашага постсавецкага грамадства – праблему патрыятызму, якую тэрмінова трэба вырашаць.

Сюжэт "Перапалоху" знешне даволі просты. У забытую Богам і пакінутую людзьмі пасля аварыі на ЧАЭС беларускую вёсачку Снапкі, дзе жывуць "без крамы, без чытанняў і без тэлевізара" яе жыхары, якіх і засталося ўсяго тры чалавекі: стары і дзве старыя, наведваецца гарадская моладзь (у пастаноўцы яна прадстаўлена як "рэперы") у пошуках зброі, якая засталася з часоў Вялікай Айчыннай вайны. Жадаючы пазабавіцца за кошт даверлівасці старога дзеда Снапка і па ходу "насаліць" яму за яго пільнасць, юнакі-скарбашукальнікі імітуюць з дапамогай мегафона і ламанай нямецкай мовы новае нашэсце немцаў на беларускую зямлю. Снапок успрымае гэты злы жарт сур'ёзна і рыхтуе сваю вёску да адпору захопнікам.

Але ўнутраная дзея спектакля – тэма патрыятызму і духоўных каштоўнасцей – больш складаная. Сапраўды, калі людзі знаходзяцца на раздарожжы, тады ўступае ў дзеянне закон "халявы": хто пакліча, панадзіць дармаўшчынай, за тым і пабягуць Кулькі і Вавёркі, якія прызвычаіліся да бяздумнага, лёгкага жыцця. Цяпер многія імкнуцца туды, дзе цяплей, багацей, сытней, утульней. І сярод іх ёсць, на жаль, моладзь, якая не жадае працаваць, а імкнецца нажыцца за кошт іншых: сваіх бацькоў, бліжэйшага акружэння; за кошт "крышавання", нарка- і порнатрафіка, продажу зброі.

– Баравік з Ткачовым узнялі вельмі важную філасофскую тэму – тэму экалогіі душы, – разважае дырэктар Гомельскага аблдрамтэатра, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Валянціна Рыгораўна Рагоўская. – Ёсць у нашым грамадстве людзі, якім многае падаецца дрэнным у сваёй Айчыне, а ўсё добрым, што за мяжой. Яны гатовыя змяніць Бацькаўшчыну, каб толькі мець "даляры". Гэта і ёсць адсутнасць патрыятызму. Вядома, што пачуццё супольнасці са сваёй дзяржавай, народам, культурай, слаўнай гісторыяй – адна з галоўных умоў псіхічнага здароўя ўсяго грамадства і кожнага чалавека.

"Перапалох" – гэта спектакль-метафара. У правым баку планшэта сцэны бачна нейкая глыба, падобная на манументальную скульптуру, статую, якая пакрыта белым палатном. Потым покрыва здымаюць і перад гледачом паўстае галоўны герой – дзед Снапок. Такім жа чынам вырашана і апошняя сцэна спектакля, але цяпер пад белым покрывам у левым баку планшэта аказваецца група дзеючых асоб з пакалення "бацькоў": Гускіна (актрыса Э.І.Бацянкова), Качкіна (актрыса Г.П.Вэвер), Вавёрка (актрыса Я.І.Канькова), а Снапок быццам уходзіць па вясковай дарозе ў пустое сяло, якое намалявана на задніку сцэны, і на імгненне спыняецца, паварочваецца напаўпаварота да гледачоў – нямое пытанне?!

Што ёсць гэтае белае покрыва ў рэжысёрскай і аўтарскай версіі? Гэта заслона абставін жыцця, якая ўтойвае непрадузятую рэальнасць. Гэтая заслона дваістая. З аднаго боку – выдатная шырма, за якой не бачна сапраўднага твару сучаснага грамадства, якое загразла ў духоўнай пустэчы. З другога боку заслона – гэта забыццё, якое не дае старым – рудыментам сучаснага соцыума – ніякай перспектывы, і яны ідуць ў нікуды. Адсюль і яшчэ адна трактоўка агульнай метафары спектакля – сон-смерць. Снапок прачынаецца як бы пайшоўшым з жыцця: усё, што з ім адбываецца, – сон адыходзячай у іншы свет свядомасці, адыходзячай з цяжкай душой: што застанецца пасля нас на гэтай зямлі? Такую трактоўку фінала дае рэжысёр Віктар Чэпелеў.

Снапок здымае з сябе гэтае покрыва падманлівасці і недасканаласці свету, становіцца відушчым, але яго аднавяскоўцы застаюцца пад каўпаком праблем…

– Спектакль выклікае розныя думкі, – гаворыць знакаміты тэатральны крытык, доктар мастацтвазнаўства Анатоль Сабалеўскі. – Хтосьці, можа, і хацеў звесці сюжэт да псіхалагічнай праўдападобнасці, але спектакль заснаваны на дасціпных элементах адвечнай тэмы – гэта мазаіка асацыяцый, метафар, здагадак, і пастаўлены ён не як псіхалагічная драма з побытавым акружэннем, а як умоўнае тэатральнае відовішча, якое ўражвае. І Снапок са старымі, і Кулёк са сваімі памагатымі – гэта, канешне, не увесь народ, абагульненне тут умоўнае. У п'есе прадстаўлена "зона", і яна ўсюды. Спектакль адбыўся.

І сапраўды, такія спектаклі, як "Перапалох", не забываюцца. Яны застаюцца ў памяці надоўга.

**Таццяна АЎДОНІНА,**
**дацэнт кафедры давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі, член Беларускай асацыяцыі літаратурна-мастацкіх крытыкаў.**

СПОРТ



# ТЭНІСІСТЫ РАЗЫГРАЛІ ПЕРШЫНСТВО

Завяршыліся камандныя спаборніцтвы па настольнаму тэнісу ў праграме студэнцкай спартакіяды, у якой прынялі ўдзел 78 студэнтаў.

Сярод каманд дзяўчат перамаглі студэнткі эканамічнага факультэта ў складзе Таццяны Юрчанка, Таццяны Дарошчанка (гр. МЭ-41) і Вольгі Уласенка (гр. ЭК-21). На другім месцы – будучыя філолагі і на трэцім – матэматыкі.

На вышэйшую прыступку п'едэстала гонару сярод мужчынскіх каманд узняліся студэнты геолага-геаграфічнага факультэта Яраслаў Герасімаў (гр. РВ-31), Мікалай Кузняцоў (гр. РВ-11) і Яўген Пырх (гр. ГН-41). Другой была каманда эканамічнага факультэта і трэцяй – матфака.

Як і ў ранейшыя гады, спаборніцтвы былі добра арганізаваны і праведзены дзякуючы галоўнай судзейскай калегіі, якую ўзначальвалі выкладчыкі Таццяна Станіславаўна Сіляева і Сяргей Аляксандравіч Яцкоў.

# НА ПАМОСЦЕ – АСІЛКІ

У Жыткавічах адбыўся чэмпіянат Беларусі па пауэрліфтынгу (сілавое трохбор'е).

Упершыню на чэмпіянаце выступалі не зборныя каманды абласцей, а калектывы фізкультуры прадпрыемстваў, арганізацый і навучальных устаноў. За ўзнагароды змагаліся 17 каманд.

Чэмпіянат выйгралі асілкі з г. Рагачова, другое месца заняла каманда з г. Мінска і трэцяе – студэнты нашага універсітэта.

У вагавай катэгорыі да 67,5 кг чэмпіёнам стаў першакурснік факультэта фізічнай культуры Аляксей Мікалаенка, які выканаў нарматыў майстра спорту. Гэта 21-ы майстар спорту, якога падрыхтаваў старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту, чэмпіён Еўропы сярод ветэранаў Уладзімір Галавач.

Сярэбранага медаля (52 кг) ўдастоены пяцікурснік эканамічнага факультэта майстар спорту Максім Пятроўскі.

У вагавай катэгорыі да 56 кг бронзавую ўзнагароду заваяваў студэнт фізічнага факультэта Сяргей Скіба.

**В. МАРЧАНКА.**

# З ЗІМОЮ РАССТАВАННЕ



Фота У. ЧЫСЦІКА.

Адраджаюцца традыцыі

# РЫБАЦКАЯ ЎДАЧА

Субота, 13 сакавіка, выдалася на дзіва цёплай і сонечнай, што якраз спрыяла заўзятым аматарам падводнай рыбалкі. А іх у калектыве нашага універсітэта – нямала, і не аднойчы яны выязджалі на спаборніцтвы да мясцовых вадаёмаў, на р. Днепр, каб паказаць сваё ўмельства і майстэрства ў рыбнай лоўлі.

На гэты раз універсітэцкі аўтобус узяў накірунак да азёраў каля в. Рудня-Марымонава. Аднак лёд тут вельмі трашчаў пад нагамі, і давялося рыбакам змяніць месца "дыслакацыі" – на прытокі р.Днепр каля в. Страдубка Лоеўскага раёна. З-за вымушанага пераезду час, адведзены для спаборніцтва, скараціўся (заставалася паўтары гадзіны). Але і за гэты невялікі прамежак універсітэцкія аматары ўсё ж паспелі паказаць на справе, хто на што варты ў падлёднай рыбалцы. Першыя плоткі і акуні трапіліся на вуды прадстаўнікоў фізічнага факультэта: Уладзіміра Шолаха, Мікалая Фядосенкі, Уладзіміра Замятніна. А па колькасці злоўленай рыбы першым стаў вадзіцель Юрый Лефебр. Самы буйны рыбны экземпляр аказаўся ў Мікалая Фядосенкі. Тут жа, на месцы спаборніцтва, пад дружныя апладысменты яго ўдзельнікаў старшыня прафкама універсітэта Г.І. Варатніцкі ўручыў Ю.Лефебру і М. Фядосенку граматы як пераможцам асабістага першынства.



Вярталіся назад рыбакі ў выдатным настроі. І як бывае ў такім асяроддзі, гучала шмат сур'ёзных і жартоўных расказаў аб удалых уловах.

Сёлетняе асабістае першынство па зімовай рыбнай лоўлі сярод прадстаўнікоў розных падраздзяленняў ГДУ прафкам прысвяціў знамянальнай даце – 100-годдзю прафсаюзнага руху ў рэспубліцы.

**(НАШ КАР.)**

**На здымку: рыбакі-аматары перад спаборніцтвамі.**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**
**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:**

– фізвыхавання і спорту – выкладчыка;
– крымінальнага права і працэсу – асістэнта;
– тэорыі і гісторыі дзяржавы і права – асістэнта;
– рускай літаратуры – асістэнта;
– тэорыі і практыкі англійскай мовы – выкладчыка (2);
– давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі – загадчыка кафедры;
– геалогіі і разведкі карысных выкапняў – старшага выкладчыка;
– геаграфіі – асістэнта;
– тэорыі і методыкі фізічнай культуры – выкладчыка.

**Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.**

**Заявы накіроўваць на адрас: 246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.**

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты універсітэта, калектыў кафедры палітычнай сацыялогіі глыбока смуткуюць з выпадку заўчаснай смерці загадчыка названай кафедры кандыдата сацыялагічных навук, дацэнта **РЫЧКОВА Аляксандра Яўгенавіча** і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

***

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры оптыкі выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку лабараторыямі названай кафедры **ПЯТРОЎСКАМУ Валерыю Мікалаевічу** з выпадку напаткаўшага яго гора – смерці **БАЦЬКІ.**

***

Дэканат фізічнага факультэта, калектыў кафедры оптыкі, студэнты групы Ф-33 выказваюць глыбокае спачуванне трэцякурсніку **МАСЛАВУ Дзмітрыю** з выпадку напаткаўшага яго гора – смерці **БАЦЬКІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14.
Тэл. 56-30-71.
E-mail: rggu@gsu.unibel.by
Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г.
Рэгістрацыйны № 263.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.
Качество печати соответствует качеству оригиналов заказчика.

РЭДАКТАР
Тамара ДУБЯК

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 4117
Падпісана да друку 23.03.2004 г.